блізкіх іх хвароба стала ўдарам, рэагуюць на сітуацыю ў адпаведнасці з рэагаваннем на яе бацькоў. У хворых дзяцей, акрамя высокага ўзроўню трывогі, выяўляюцца ўнутраныя канфлікты, звязаныя з недастатковым разуменнем іх дарослымі. Дзеці адчуваюць сябе пакінутымі, у іх фарміруюцца паталагічныя адносіны да сям'і. Яны выяўляюцца ў дэспатычных паводзінах хворага дзіцяці з поўным ігнараваннем інтарэсаў сям'і або ў абыякавасці да членаў сям'і з замкнёнасцю ў сабе, або ў поўнай залежнасці ад бацькоў з адчуваннем віны перад імі, успрыманні хваробы як "пакарання" за свае дрэнныя паводзіны.

Многія бацькі адзначаюць, што пасля лячэння ў дзяцей з'яўляецца сіндром "бальніцы", страх перад новым акружэннем, комплекс непаўнацэннасці. Аднак гэта ж характэрна і для бацькоў, вымушаных зміріцца са зменай пастаяннага месца працы, з разрывам адносін з былымі сябрамі, адчуваць ціск і дакор з боку сваякоў. У такой сітуацыі амаль усе бацькі хацелі б атрымаць дапамогу сацыяльнага педагога і псіхолага.

Падагульняючы сказанае, бачым, што праблема лячэння анкагематалагічных хворых не толькі медыцынская, яна патрабуе аб'яднання намаганняў спецыялістаў розных сфер, у першую чаргу работнікаў сацыяльнай сферы.

**Л.М.Грыцкевіч,**
*суіскальнік кафедры*
*сацыялогіі і культуразнаўства*

## РОЛЯ ЎСТАНОЎ КУЛЬТУРЫ Ў АДРАДЖЭННІ, ЗАХАВАННІ І РАЗВІЦЦІ ТРАДЫЦЫЙНАЙ МАСТАЦКАЙ КУЛЬТУРЫ

Традыцыйная мастацкая культура адлюстроўвае характар жыцця, ідэалы, эстэтычныя патрабаванні народа, надае самабытнасць сучаснай нацыянальнай культуры,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аказвае ўплыў на прафесійнае мастацтва. Менавіта таму ўсе даследчыкі адзначаюць неабходнасць яе адраджэння, захавання і развіцця.

Адраджэнне традыцыйнай мастацкай культуры прадугледжвае вяртанне ў сучасную культуру беларускага народа даўно забытых абрадаў, свят, традыцый, рамёстваў і іншых відаў народнай мастацкай культуры; пераемнасць традыцый на аснове сям'і; далучэнне да мастацкай творчасці шырокіх народных мас.

Дзейнасць у гэтым кірунку вядзецца мясцовымі органамі культуры ў межах сваіх магчымасцей. Яны распрацоўваюць уласныя мясцовыя праграмы развіцця традыцыйнай мастацкай культуры з улікам рэгіянальных асаблівасцей. Напрыклад, распрацаваны канцэптуальныя асновы, праграмныя кірункі па адраджэнні і захаванні традыцыйнай мастацкай культуры Палесся. Над праграмай працаваў часовы творчы калектыў, створаны пры Беларускім інстытуце праблем культуры, у склад якога ўвайшлі дзеячы мастацтва, такія як Е.М.Сахута, В.Д.Ліцвінка, В.С.Цітоў, В.Я.Качаргін, І.Р.Голубева, Я.В.Левяроўская, П.В.Церашковіч. Складанню праграмы дапамагалі навуковыя экспедыцыі ва ўсе раёны Палесся, у час якіх вывучаліся асаблівасці, традыцыі і сучасны стан мастацкай культуры, анкетаванне насельніцтва з мэтай выяўлення яго пажаданняў, адносін да мастацкай спадчыны, узроўню нацыянальнай самасвядомасці.

Значную ролю ў адраджэнні, захаванні і развіцці традыцыйнай мастацкай культуры адыгрываюць установы культуры, асабліва сельскія. З вопыту работы відаць, што сельскія Палацы культуры і сельскія клубы дапамагаюць захаваць мясцовыя звычаі, абрады, развіць мясцовыя промыслы. Многія ўстановы культуры назапасілі багаты вопыт такой работы, які неабходна абгрунтаваць і прапагандаваць. Па ініцыятыве кіраўнікоў устаноў культуры могуць быць падрыхтаваны тэле- і радыёперадачы, артыкулы ў сродках інфармацыі. Гэта дасць магчымасць народным майстрам, удзельнікам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фальклорных калектываў і жыхарам пэўнай мясцовасці адчуць каштоўнасць і патрэбу іх мясцовых традыцый, неабходнасць іх захавання.

Вялікая роля ў зберажэнні ўзораў народнай мастацкай творчасці належыць музеям (школьным, калгасным і саўгасным), якія прымаюць непасрэдны ўдзел у выхаванні маладога пакалення. Пры музеях дзейнічаюць клубы, студыі народных майстроў, ствараюцца фальклорныя калектывы. Музеі становяцца не толькі сховішчам мастацкай спадчыны, але і асяроддзем, якое захоўвае і развівае асаблівасці рэгіянальнай культуры.

Адраджэнне, захаванне і развіццё традыцыйнай мастацкай культуры немагчымыя без мэтанакіраванай дзяржаўнай палітыкі. У законе "Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь" галоўнае месца адведзена менавіта традыцыйнай культуры, падкрэсліваецца неабходнасць стварэння ўмоў для адраджэння і развіцця гістарычных традыцый народнай творчасці, аўтэнтычнага фальклору, абрадаў, свят, традыцыйных промыслаў. Стварэнне такіх умоў у многім залежыць ад устаноў культуры і спецыялістаў, зацікаўленых у глыбокім вывучэнні і захаванні традыцыйнай мастацкай культуры.

**Гуры Мухамед,**
*аспирант кафедры менеджмента социокультурной сферы*

## ЭВОЛЮЦИЯ МАРКЕТИНГА И КУЛЬТУРА СОВРЕМЕННОГО ОБЩЕСТВА

Маркетинг в условиях рыночной экономики — явление сравнительно молодое, вызванное к жизни эволюцией менеджмента и предпринимательства в XX ст.

Первоначально маркетинг возник в связи с попытками преодолеть затоваривание, как деятельность по стимулированию сбыта, интенсивной рекламе. Постепенно становилось ясным, что речь должна идти о большем — переориентации всей технологии менеджмента



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ